# Урок 53

Два турысты адначасова выйшлі насустрач адзін аднаму з двух пасёлкаў, адлегласць паміж якімі — 20 км. Скорасць першага турыста — 6 км/г, а другога — 4 км/г. Праз які час турысты сустрэліся?




- Спачатку даведаюся, на колькі кіламетраў скарачалася адлегласць паміж пешаходамі за 1 г (скорасць збліжэння).
- Потым даведаюся, праз які час пешаходы сустрэліся.

**1.** Адлегласць паміж гарадамі — 850 км. З гэтых гарадоў насустрач адна адной адначасова выехалі дзве машыны са скарасцямі 90 км/г і 80 км/г. Праз які час машыны сустрэнуцца?

**2.** Рамка для фотаздымка прамавугольнай формы мае памеры 16 см і 9 см. Плошча фотаздымка складае $\frac{1}{2}$ частку плошчы рамкі. На колькі квадратных сантыметраў плошча рамкі большая за плошчу фотаздымка?

**3.** Знайдзі значэнні выразаў, калі $m$ роўна 3, $n$ роўна 5.

$150 \cdot m : n$ $\quad$ $150 \cdot n : m$ $\quad$ $150 : (m \cdot n)$

**4.** Знайдзі значэнні выразаў.

$235 \cdot 3 - 916 : 4$ $\qquad$ $756 : (881 - 877) \cdot 5$



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 53



**5.** Устаў прапушчаныя лікі.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Дзялімае | 81 | 45 | ? | 80 | ? |
| Дзельнік | 15 | ? | 12 | 25 | 9 |
| Дзель | ? | 4 | 9 | ? | 21 |
| Астача | ? | 1 | 7 | ? | 5 |

**6.** Дзядзька Федзя старэйшы за пляменніка Жэню ў 3 разы. Жэня маладзейшы за дзядзьку Федзю на 24 гады. Колькі гадоў Жэню? Колькі гадоў дзядзьку Федзю?

**7.** Здагадайцеся, якой можа быць даўжыня кожнага адрэзка. Праверце здагадку, выканаўшы вымярэнні з дапамогай лінейкі.




**?** Адлегласць паміж гарадамі — 190 км. Скорасць збліжэння двух матацыклаў, якія выехалі адначасова насустрач адзін аднаму з гэтых гарадоў, — 190 км/г. Праз які час матацыклы сустрэнуцца?

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.
22 000 · 3     1000 : 4     1500 · 6 + 96 000 : 16

**2.** З двух канцоў лядовай дарожкі даўжынёй 200 м насустрач адзін аднаму адначасова выбеглі на каньках Павел і Часлаў. Скорасць Паўла — 3 м/с, а Часлава — 2 м/с. Праз колькі секунд Павел і Часлаў сустрэнуцца?



Правообладатель Национальный институт образования